

# Універсітэцкі ВЕСНІК

№ 9 (68)
кастрычнік, 2002

ГАЗЕТА МАГІЛЁЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя А. А. КУЛЯШОВА

Выдаецца з мая 1996 г.
Перыядычнасць – 1 раз у месяц

## ХРОНІКА

### КАСТРЫЧНІК

**1** – канцэрт-віншаванне "З глыбокім пачуццём павагі", прысвечаны Міжнароднаму Дню сталых людзей.

**2** – дабрачынная акцыя "Пабудуем бібліятэку разам";

— семінар-нарада куратараў акадэмічных груп.

**8** – пасяджэнне школы студэнцкага актыву "Лідэр".

**8-10** – навукова-практычная Міжнародная канферэнцыя "Рэгіянальныя праблемы сацыяльна-эканамічнага і геаэкалагічнага развіцця Беларусі і сумежных тэрыторый".

**14** – свята "Самая чулая, мудрая, пяшчотная", прысвечанае Дню Маці.

**16** – згуртавальная канферэнцыя грамадскай арганізацыі Беларускі Рэспубліканскі Саюз Моладзі;

— навукова-метадычны савет, на якім разгледжаны наступныя пытанні:

1. Аб выніках агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю дзейнасці факультэтаў і кафедраў універсітэта.

2. Аб рабоце кафедраў асноў медыцынскіх ведаў па рэалізацыі адукацыйных стандартаў.

**17** – Савет універсітэта, на якім абмеркаваны наступныя пытанні:

1. Аб эфектыўнасці дзейнасці факультэта давузаўскай падрыхоўкі і прафарыентацыі.

2. Выкананне рашэнняў Савета універсітэта, прынятых у 2001-2002 навучальным годзе.

3. Балаціроўка навукова-педагагічных кадраў.

**18** – рэктарат, на якім разгледжаны наступныя пытанні:

1. Аб падрыхтоўцы універсітэта да работы ў зімовых умовах.

2. Аб рэканструкцыі біябазы "Любуж";

— пасяджэнне рэдкалегіі часопіса "Веснік МДУ імя А.А.Куляшова" па пытанні фарміравання наступнага нумара часопіса.

## ПРОБЛЕМЫ РАЗВИТИЯ РЕГИОНОВ

8-10 октября 2002 г. в университете состоялась Международная научно-практическая конференция «Региональные проблемы социально-экономического и геоэкологического развития Беларуси и сопредельных территорий». Конференция собрала участников из 12 регионов Беларуси, России и Украины, в том числе из: Москвы, Санкт-Петербурга, Пскова, Сум, Винницы, Минска, Витебска, Гомеля, Могилева, Бреста и других городов. Организаторами конференции выступили Могилевский областной отдел Белорусского географического общества, лаборатория социально-гуманитарных проблем региона и кафедра географии и охраны природы МГУ им. А.А.Кулешова.

Участниками конференции стали как представители вузовской (всего было представлено 14 вузов государств СНГ), так и академической науки (Институт географии РАН, Институт экономики НАН Беларуси, НИЭИ Министерства экономики Беларуси, Институт проблем использования природных ресурсов и экологии НАН Беларуси). Конференция объединила ученых разных специальностей, интересующихся проблемами регионального развития: географов, экономистов, демографов, социологов и экологов.

8 октября конференция работала в главном корпусе университета, где состоялись пленарное и секционные заседания, а 9 октября – в учебном корпусе №3 (факультет естествознания), где проходили секционные заседания. Именитые гости конференции 9 октября выступили с публичными лекциями для студентов и преподавателей факультета естествознания: «История географических исследований в Республике Беларусь» (Президент ОО «Белорусское географическое общество» профессор В.С.Аношко), «Модели глобализации и необходимость региональной интеграции» (ведущий научный сотрудник Института географии РАН профессор Г.В.Сдасюк), «Пространственная самоорганизация общества: концепция кольцевых структур и возможности ее применения» (профессор Российского государственного педагогического университета им. А.И.Герцена В.Л.Мартынов.) 10 октября для участников конференции была организована научная экскурсия по маршруту: Могилев—Мстиславсль—Могилев.



На конференции широко обсуждались проблемы развития регионов трех сопредельных стран. Участниками конференции было отмечено следующее:

Практически все регионы России, Беларуси и Украины в современных условиях могут рассматриваться как проблемные, причем проблемы развития регионов невозможно игнорировать, они являются одной из угроз национальной безопасности трех сопредельных стран.

Многие проблемы сопредельных стран имеют общие корни, им присущ сходный характер развития, а социально-экономическое состояние в регионах России, Беларуси и Украины в значительной степени определяется масштабами их взаимодействия в области внешней торговли, научно-технического и культурного сотрудничества.

Действенным инструментом решения проблем регионального развития могут стать региональные стратегии устойчивого развития. Без устойчивого развития регионов невозможна реализация Национальных стратегий устойчивого развития. В подобных стратегиях остро нуждаются все регионы сопредельных стран.

Разработка и реализация региональных стратегий устойчивого развития требует тесного сотрудничества ученых разных специальностей, управленцев и практиков всех государств СНГ, и, прежде всего, России, Беларуси и Украины в силу их особенно тесной экономической интеграции и общих проблем развития.

Для ознакомления с разработками ученых сопредельных стран по проблемам регионального развития и путям их решения ученые договорились регулярно проводить научно-практические семинары «Проблемы устойчивого развития регионов России, Беларуси и Украины».

**Г.В.РИДЕВСКИЙ,**
**Председатель Могилевского областного отдела Белорусского географического общества, зав. лабораторией социально-гуманитарных проблем региона МГУ им. А.А.Кулешова.**

## НОВОСТИ «УВ»

### СОСТОЯЛАСЬ КОНФЕРЕНЦИЯ

В Могилевском государственном университете им А.А.Кулешова 16 октября 2002 года состоялась конференция по созданию первичной организации Белорусского Республиканского Союза Молодежи, на которой присутствовало более 70 делегатов, представляющих все факультеты нашего вуза.

Большинством голосов делегаты избрали первым секретарем БРСМ в университете Д.С.Перминова, который ранее являлся секретарем первичной организации БПСМ.

Мы поздравляем молодую организацию БРСМ и Дмитрия Сергеевича Перминова с избранием и желаем успехов в дальнейшей деятельности.

**Соб. корр.**

### ФАКУЛЬТЕТ ГОТОВИТСЯ К ЮБИЛЕЮ

25 сентября 2002 года на заседании Совета факультета педагогики и психологии детства был рассмотрен и утвержден план по подготовке к 25-летию факультета, мероприятий в который вошли вопросы информационно-пропагандистской и организационной работы, а также мероприятия по укреплению материальной базы.

В рамках мероприятий 9-10 апреля 2003 г. будет проведена Международная научно-практическая конференция «Актуальные проблемы педагогики и психологии детства».

Активное участие в подготовке юбилейных мероприятий наряду с преподавателями принимают студенты.

Коллектив преподавателей и студентов факультета выражает искреннюю благодарность ректорату МГУ им А.А.Кулешова за оказанную помощь и поддержку в подготовке к юбилею. Мы также надеемся, что в организации и проведении юбилейных мероприятий нас поддержат все факультеты и структурные подразделения университета.

**Елена Михеенко,**
**студентка 5 курса ФППД.**

### УЧЕБА КУРАТОРОВ

Третьего октября состоялся традиционный семинар кураторов академических групп, который открыл проректор по учебной работе В.И. Попов. С докладом об организации работы кураторов в 2002-2003 году выступила начальник отдела воспитательной работы Т.Н.Кузьмина. Значительный интерес у собравшихся вызвало выступление доцента кафедры философии О.В.Дьяченко о проблемах распространения нетрадиционной религиозности среди молодежи и демонстрация видеоматериалов. Полезными были и советы кураторам социального педагога отдела воспитательной работы В.А.Шагиновой по профилактике у студентов вредных привычек. На семинаре кураторы смогли ознакомиться с литературой по проблемам воспитательной работы со студентами.

**Наш корр.**

## ВЫНІКІ АГЛЯДУ - КОНКУРСУ

### НА ЛЕПШУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ДЗЕЙНАСЦІ ФАКУЛЬТЭТАЎ І КАФЕДРАЎ УНІВЕРСІТЭТА

На навукова-метадычным савеце падведзены вынікі агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю дзейнасці факультэтаў і кафедраў універсітэта.

Згодна з палажэннем конкурсу на лепшую арганізацыю работы падраздзяленняў універсітэта ў верасні 2002 г. на факультэтах былі падведзены вынікі і вызначаны пераможцы сярод спецыяльных кафедраў, а камісіяй універсітэта і сярод факультэтаў.

Для ўдзелу ў заключным туры конкурсу сярод кафедраў ад кожнага факультэта (за выключэннем факультэта эканомікі і права) вылучана па адным прэтэндэнце. Такім чынам, камісія разгледзела восем прадстаўленняў.

Камісія прапануе па выніках дзейнасці ў 2001-2002 навучальным годзе лепшай кафедрай універсітэта прызнаць кафедру філасофіі (заг. дацэнт Старасценка В.У.).

Што датычыцца астатніх кафедраў-удзельніц заключнага тура конкурсу, то камісія рэкамендуе рэктарату адначыць іх заахвочвальнымі прызамі ў вызначаным фінансавым аб'ёме па наступных намінацыях:

— за падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі – кафедру беларускай мовы (заг. праф. Рагаўцоў В.І.);

— за падрыхтоўку і выкананне падручнікаў для ВНУ і школы – кафедру анатоміі і фізіялогіі (заг. праф. Машчанка М.В.);

— за падрыхтоўку вучэбна-метадычных комплексаў для базавай школы – кафедру методыкі выкладання матэматыкі (заг. дац. Латоцін Л.А.);

— за развіццё і ўкараненне ў навучальны працэс студэнцкай навукі – кафедру хіміі (заг. дац. Палячонак Л.Д.);

— за развіццё творчых здольнасцей студэнтаў – кафедру тэорыі і методыкі музычнага выхавання (заг. дац. Рэва В.П.);

— за вучэбна-метадычнае забеспячэнне чытаемых дысцыплін – кафедру педагогікі дзяцінства і сям'і (заг. дац. Носава А.А.).

— за арганізацыю правядзення Дзён кафедры ва універсітэце – кафедру тэорыі і практыкі англійскай мовы (заг. дац. Андрэева Т.М.);

Для правядзення конкурсу сярод факультэтаў камісія ўстанавіла тры прызавыя месцы. У конкурсе прымалі ўдзел усе факультэты універсітэта.

Па выніках тайнага галасавання членаў конкурснай камісіі прызавыя месцы размеркаваны наступным чынам:

І места – фізіка-матэматычны факультэт (дэкан дац. Старавойтаў Л.Я.);

ІІ места – гістарычны факультэт (дэкан дац. Дзмітрачкоў П.Ф.);

ІІІ месца – з роўнасцю галасоў падзялілі педагагічны факультэт (дэкан дац. Іваноў В.Г.) і факультэт фізічнага выхавання (дэкан дац. Шутаў У.У.).

Конкурсная камісія выказала пэўныя прапановы:

Захаваць і на далейшае правядзенне штогадовых аглядаў-конкурсаў сярод факультэтаў і кафедраў, а таксама вярнуцца і да конкурсу акадэмічных груп на ўзроўні факультэтаў.

Удасканаліць, а пры неабходнасці распрацаваць лагічную і па магчымасці завершаную сістэму ацэнкі вынікаў па ўсіх відах дзейнасці.

Кіраўнікам падраздзяленняў больш адказна падыходзіць да падрыхтоўкі выніковых службовых справаздач, матываваных заключэнняў для ўдзелу ў конкурсе.

Рэкамендаваць кіраўнікам усіх адзначаных падраздзяленняў асвятліць вопыт сваёй работы ў газеце "Універсітэцкі веснік".



### ПОСТРОИМ БИБЛИОТЕКУ ВМЕСТЕ

Под таким девизом проходила в Республике Беларусь благотворительная акция по сбору средств на строительство нового здания Национальной библиотеки. Активное участие в этой акции приняли студенты, преподаватели и сотрудники университета. Особую благодарность хочется выразить работникам социально-психологической службы, членам координационного студенческого совета и заведующему кафедрой русской и зарубежной литературы С.Э.Сомову. Студенты-филологи в течение двух-трех часов внесли более 90 тысяч рублей на строительство библиотеки, что явилось своеобразным рекордом среди всех факультетов. Всего от нашего вуза было перечислено на строительство Национальной библиотеки 800 тысяч рублей, 438 тысяч из них собрано в ходе благотворительной акции. Спасибо всем, кто принял в ней участие!

**Наш корр.**

**Фото С.Ф.Волкова. Идет сбор средств на строительство библиотеки.**

### *Вниманию организаторов информирования!*

Темы информационных часов и встреч в ноябре т.г.

1. Продовольственная безопасность населения – важное направление государственной политики.

2. Высшая школа Республики Беларусь: состояние и перспективы.

3. В единстве сила (к созданию Белорусского Республиканского Союза Молодежи).

4. Инвестиции в будущее (к Международному дню студентов).

5. Молодежь за здоровый образ жизни (к Международному дню отказа от курения и Всемирному дню борьбы со СПИДом).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Новая зямля"

(Урыўкі)

## ВЕЧАРАМІ

Малюнкі родныя і з'явы!
Як вы мне любы, як цікавы!
Як часта мілай чарадою
Вы ўстаяце перада мною!
І так панадта смеяцеся
Жывою баграю па лесе,
І златаблескімі снапамі
Праменняў-стрэлаў над палямі
І брыльянцістаю расою,
Калі гарачаю касою
Скрозь лісцяў сетачкі-аконцы
На ёй заззяе ціха сонца,
Яе так песціць, так кахае,
Па ёй вясёлкі рассыпае!
Я бачу роўныя пакаты
Палёў за Нёмнам і іх шаты –
Аўсоў палоскі, лавы жыта,
Што морам золата разліта;
І грэчак белыя абрусы,
І лесу два крылы, як вусы,
І цёмны роў, вадой прабіты,
Такі зацяты і сярдзіты;
Ядлоўцаў шэрыя аблогі,
Дзе белы мох, сівец убогі
Пясочак жоўты засцілаюць
І дзе зайцы прыпынак маюць.

* * *

Але нявіднымі ніцямі
Я моцна-моцна звязан з вамі,
Малюнкі роднае краіны!
Эх, зараслі вы, пуцявіны,
У гэты мілы мой куточак,
Дзе ные жоўценькі пясочак
Пад летнім сонцам, пад спякотай
І ззяе смутнай пазалотай
Над самым Нёмнам
срэбраводным,
Так сэрцу блізкім-блізкім,
родным.
І зараслі не палынамі,
Не крапівой, не драсянамі,
Не чаратом, не лебядою –
А беларускаю бядою.
Ды покі будзе сэрца біцца,
Яно не зможа пагадзіцца
Ні з гэтым гвалтам, ні з бядою
Над нашай роднаю зямлёю...

* * *

Няхай агонь і жар пакуты
Навекі спаліць здзек той люты,
Які спрадвеку там пануе,
Над тым, хто родны скарб шануе
І хто ўсім сэрцам і душою
Астацца хоча сам сабою.
Жыві ж, наш край! Няхай надзея
Гарыць у сэрцы і мацнее,
Што хоць не мы, дык нашы дзеці
Убачаць цэльным цябе ў свеце!



***Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас
парывае?
Чым так прыкованы я?..***

## КІНЬЦЕ СМУТАК

Што вы, хлопцы спахмурнелі?
Ці каго вы пахавалі?
Ці няшчасце так здалела,
Што нуда апанавала?
Плюньце, хлопцы! Заспявайма,
Каб аж вокны задрыжалі!
Ва ўсе грудзі загукайма,
Каб і думкі паўцякалі!
Ці ж мы будзем вечна гнуцца,
Апускаць бязвольна рукі?
Няхай слёзы больш не льюцца,
Няхай нас не знаюць мукі!
За работу жыва, жыва!
Каб нас доля не ўшчувала,
Каб не сохла наша ніва,
Каб нуда нас больш не гнала!

# Я песняю

# Волат нацыянальнай культуры

Паэт, празаік, драматург, публіцыст, педагог, дзяржаўны дзеяч... Вось ужо амаль стагоддзе навукоўцы імкнуцца яго разгадаць. Варта пагадзіцца з галоўнай высновай: асоба такога шырокага творчага дыяпазону выклікае рэнесанснасць часу. Сапраўды, Якуб Колас уваходзіў у літаратуру побач з іншымі волатамі слова, на самым уздыме Новага Адраджэння. На пачатку XX стагоддзя гэта былі пакліканыя, яны самаахвярна павінны былі здзейсніць подзвіг у імя будучыні, дзеля сучаснікаў і нашчадкаў.

Сялянскі хлапчук, пасля семінарыст і вясковы настаўнік, надзелены наздвычайным талентам, К.М.Міцкевіч, у адрозненне ад сваіх многіх калегаў, прайшоўшых жорсткія класы казённай адукацыі, пільна ўслухоўваўся ў рытмы жыцця, настрой эпохі, павінен быў на ўсё гэта адгукнуцца. Ён дэбютаваў амаль адначасова ва ўсіх жанрах, адразу звярнуўшы на сябе ўвагу.

Якуба Коласа ўспрымалі як выключна сялянскага паэта. І ў гэтым была доля праўды. На пачатку стагоддзя паўстала немалаважная праблема самапазнання і самасцвярджэння. Каб рухацца наперад пераважна сялянскай нацыі, неабходна было ўсвядоміць, хто яны такія, акрэсліць для сябе цэлы шэраг неабходных уласных патрабаванняў. Свядомай нацыянальнай інтэлігенцыі проста неабходна было раскалыхаць зацішаны лад жыцця, звыкласць беларускага сялянства да ўмоў жыцця, а іншых слаёў грамадства да падпарадкавання чужым памкненням і культурным уплывам.

Сялянская маса найбольш кансерватыўная. І тут былі свае станоўчыя прыклады і негатывы. Па-першае, прытрымліваючыся даўняга ўкладу жыцця, жыхары вёскі здолелі захаваць вялікі нацыянальны духоўны патэнцыял, па-другое, застаючыся ва ўсім адасобленымі, грунтуючыся на дзедаўскіх традыцыях, яны станавіліся грамадска пасіўнымі. Раскалыхаць, разбудзіць народ і ўваходзіла ў планы адраджэнцаў. І справа гэтая была нялёгкай, хоць і перспектыўнай. Нездарма ж Якуб Колас, завяршаючы паэму "Сымон-музыка" у 1918 годзе ў адным з варыянтаў, увасабляючы ў Сымоне ўвесь народ, пісаў у фінале:

Ды ён ўстане, ён ачнецца,
Круг не скончыў свой Сымон,
На шырокі шлях праб'ецца,
Хоць мо й доўгі будзе сон.

Каб здзейсніць гэту велічную задачу, творцам неабходна было спачатку паказаць селяніну, які ён, што яму перашкаджае жыць, а пасля клікаць у новыя далі. Можа і таму, у адрозненне ад Купалы, у Якуба Коласа пераважае побытавая тэма. Ці не залішне вялікае марнатраўства траціць сілы на сямейныя і суседскія сваркі, а свае няўдачы спрабаваць згасіць у гарэлцы,на чым крыху пазней засяродзіць увагу і маладзейшы адраджэнец Максім Гарэцкі.

Але Колас не аднастайны, у чым яго папракалі крытыкі ў пачатку стагоддзя. У яго адразу акрэсліліся дзве важныя тэмы: выяўленне сялянскага жыцця, апеляцыя да селяніна, спроба паказаць, што ў сваім гаротным жыцці шмат у чым ён вінаваты і сам, і памкненні інтэлігента, яго думы і перажыванні, выяўленне парываў ад пагрозна-бунтарскага да засяроджана-філасофскага асэнсавання праяў грамадскага жыцця.

З селянінам неабходна было гаварыць звыклай для яго мовай. Можа таму ў ранніх вершах Якуба Коласа пераважаюць вобразы аднатыпныя, выхапленыя з асяродку самога жыцця ("Вёска", "Роднае поле", "Мужычае жыццё", "Наша доля" і інш.). Паэт разлічваў і на грамадскую думку, калі засяроджваў увагу на непрываблівым стане самой вёскі і гаротным лёсе яе жыхара. Успрыняццю такому садзейнічала і размераная плынь вершаў, пабудова страфы.

Між узгоркаў над ракою
Выглядае сіратою
Наша беднае сяло.
Убраў стрэхі мох калматы,
Набок скрыўленыя хаты,
Як бы ў дол яно ўвайшло.
На пагорку ў аддаленні
Насып, крушнямі каменне,
Смутна крыжыкі стаяць.
А ўнізе пад іх нагамі,
Спаласканыя слязамі,
Косы родныя ляжаць.
"Наша сяло".

Элегійны матыў, пэўнае адчуванне журбы праяўляецца і ў вершах пейзажных, у якіх раскрываецца прыгажосць роднага краю. Паэта асабліва непакоіць такая неадпаведнасць, несуладнасць паўсюднай прыгажосці і людской беднасці ("Родныя вобразы", "Пад шум ветру", "Асенні дождж", "Хмаркі" і інш.). Але і ў гэтых творах паэт звяртаецца да чалавека, напамінае, што само па сабе нічога не зменіцца, калі не ачнуцца ад літаргічнага сну.

І снуецца цень пакуты
І снавацца будзе,
Покі вочы не развяжуць,
Не расчыняць людзі.
"Вобраз пакуты".

Самой матывацыяй жыццясцвярджальная лірыка Якуба Коласа накіравана ў будучыню. Якраз тут і выяўляецца вобраз інтэлігента-дэмакрата, чалавека, зацікаўленага ў змяненні застойнай плыні жыцця ("Змаганніку", "Сябрам-выгнаннікам", "Наша возьме" і інш.). Велічнасць вясенняга аднаўлення прыроды, стваральная сіла дажджу, вобразы грому, навальніцы выяўляюць радасны настрой, сцвярджаюць, што побач з непасільнай працай у селяніна ёсць свае радасці. Толькі трэба самому быць актыўным. І неабавязкова ў такіх вершах шукаць рэвалюцыйную сімволіку. Паэт усім ладам сваёй творчасці сцвярджаў менавіта эвалюцыйны шлях перабудовы грамадства на аснове нацыянальнага самасцвярджэння, якому будзе садзейнічаць адукацыя на роднай мове.



*Якуб Колас у рабочым кабінеце. 1952 год*

Хай святло навукі яснай
Заблішчыць, як сонца
ўсход,
Няхай родным словам
шчасна
Загаворыць наш народ.
"Мы маўчалі, як нямыя..."

Высакароднасць працоўнага чалавека сцвярджаў Якуб Колас і ў апавяданнях, паказваючы супярэчлівасць самога жыцця і характару асобы ("Васіль Чурыла", "Малады дубок", "У старых дубах" і інш.). Але і тут выяўляў асаблівасці беларускага менталітэту, здольнасць лёгка купляцца на дробязныя абяцанні або сіюмінутныя выгады ("Выбар старшыні", "Слабода"). Гэтыя апавяданні сваёй матывацыяй актуальныя і для сённяшняга дня. Чалавек не змяніўся.

Вядома, вяршыннымі творамі Якуба Коласа з'яўляюцца "Новая зямля" і "Сымон-музыка". У гэтых творах паэту ўдалося ўвасобіць усе рысы беларуса, сцвердзіць яго права на ўласнае шчасце, праз пошукі Міхала, Антося і іншых герояў Колас — спрадвечнае права беларуса на сваю гісторыю, неподзельную Радзіму. Зямля ў творы ўяўляецца як канкрэтны надзел і вобраз Радзімы, яна сцвярджала пачуццё незалежнасці, уласнага гонару. Ці не таму сацыялагізатары імкнуліся ўбачыць у творы толькі сродак для ўзбагачэння, што давала падставы абвінавачваць пісьменніка ў паэтызацыі кулацтва. Аспекты паэтызацыі побыту чалавека, яго працы такой знявагі не вытрымалі. Вярнуўшыся дадому, ён стаў пісаць ліст сябру Сяргею Гарадзецкаму, яшчэ большаму ізгою савецкай улады. Паэт хацеў выказаць душэўны боль, але сэрца не вытрымала.

Велічнасць фігуры Якуба Коласа бачыцца праз вякі. Радкамі з верша Якуба Коласа "Песняй вітаю я вас", напісаным з прыватнага выпадку ў сярэдзіне трыццатых, Якуб Колас як бы звяртаецца да нашчадкаў нават у неабсяжнай будучыні. Такая магічная сіла слова Вялікага Паэта.

**Я.І.КЛІМУЦЬ,
дацэнт.**

# ПА МЯСЦІНАХ ЯКУБА КОЛАСА

Яшчэ на другім курсе ў нас з'явілася жаданне прайсціся па сцежках народнага пісьменніка Беларусі.

Нарэшце мы вырашылі здзейсніць нашу задуму.

Першы прыпынак быў у Мінску. Мы наведалі Дом-музей Якуба Коласа. Нас крыху і ўразіла: бо чакалі больш незвычайнага. А тут сярод высокіх разгалістых дрэў стаіць невысокі дамок. Як высветлілася, у ім амаль увесь пасляваенны час і жыў Якуб Колас. Пераступіўшы парог, мы раптам адчулі незвычайнае хваляванне. Пакоі, рэчы, стол, за якім працаваў пісьменнік, — усё гэта надавала ўражанне прысутнасці Якуба Коласа побач з намі. Няўжо мінула амаль паўстагоддзя, як яго не стала?

Далей наш шлях памкнуўся на Стаўбцоўшчыну.

Ад Мінска па новай дарозе, якую завуць "Алімпійкай", даехалі хутка. Першы прыпынак быў у Акінчыцах, дзе і нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, будучы Якуб Колас. Нас гасцінна сустракаў унук дзядзькі Юзіка, малодшага брата Якуба Коласа, Юрый Міхайлавіч Міцкевіч. Ён распавёў пра гісторыю з'яўлення ў гэтых мясцінах Міхала, бацькі паэта. На гэты конт існуюць нават паданні. А ўсё пачалося з таго, што аднойчы сюды, на бераг Нёмана, ва ўласную пушчу прыехаў яе ўладальнік Радзівіл. Ён даведаўся, што мясцовыя сяляне і жыхары мястэчка Стоўбцы няшчадна крадуць лес і іншае багацце. Таму пастанавіў зладзіць на ўскрайку заставы, стварыць лясніцтва, каб спыніць тут вольнае гаспадаранне мясцовых людзей. Так стаў Міхал леснікам у Акінчыцах, дзе ў лесе было ўсяго тры хаты. Лясніцтва, дзе жыў ляснічы, хата для абслугі і леснічоўка. Апошняя аднаўлена ў тым выглядзе, як і была ў XIX стагоддзі.

З цікавасцю мы глядзелі і на самаробныя гаспадарчыя рэчы ў гумне і пуні. Асабліва здзівіла сячкарня, такая прылада для падрыхтоўкі сечкі з саломы і сена для жывёлы. Звычайная вялікая каса, прымацаваная да жолаба. Ёю гаспадар з дапамогай дзяцей рэзаў салому і сена. Хадзілі па ваколіцах, глядзелі і не давалі сабе веры, што тут, на вуліцы, забудаванай сучаснымі дамамі і катэджамі г. Стоўбцы, сто дваццаць гадоў таму была пушча, дзе запраста можна было сустрэць ваўкоў, дзікоў і ласёў. Распавядаюць, што нават заходзілі і мядзведзі, не кажучы ўжо пра рысь!!!

Ад асфальтаванай дарогі пешшу ішлі ў Альбуць. Усім, відаць, вядома, што ў "Новай зямлі" яна апаэтызавана як Парэчча. Шлях гэты названы імёнамі герояў "Новай зямлі" і "Сымона-музыкі": засяроджаны Міхал, Антось з рыбалавецкімі прыладамі, ёсць і "дзедаў човен", і шмат іншых герояў. Праз драўляную кладку пераходзім ручэй – і адразу ўсплываюць на памяць радкі:

Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка...

Так мы апынуліся на паляне, дзе сярод сакавітых траў і магутных дрэў утульна размясцілася сядзіба: хата, пуня і гумно, а побач пасека, дзе і зараз мясцовыя калгасныя пчаляры збіраюць мёд.

Хата крыху большая за акінчыцкую, але пабудавана так жа: адзін пакой, печ, што займае трэць хаты разам з ляжанкаю, і палаці з другога боку, дзе спалі дзеці. Згадваецца раздзел "Дарэктар", калі Яська, напалоханы расповядамі дзяцей пра лясныя жахі, ніяк не хацеў класціся спаць с краю. На ляжанцы пасля працы ў полі грэў спіну дзядзька Антось. Каморка і сенцы таксама не надта прасторныя, але зробленыя так, каб у гаспадыні ўсё было пад рукой.

Зараз хатка ператорана ў дом-музей "Новай зямлі" і "Сымона-музыкі". Усё зроблена так, як апісана ў знакамітай паэме. Як паведаміў нам наш экскурсавод, у гумне вырашылі зрабіць куток дзядзькі Антося, які быў заядлым рыбаком. Там і сабраны ўвесь рыбацкі рыштунак, прытым засталіся многія рэчы, што зроблены самім дзядзькам Антосем.

Нам не хацелася адыходзіць з такіх жывапісных мясцінаў, але час патрабаваў. Мы хацелі яшчэ апынуцца ў Смольні. Мемарыяльны комплекс Смольні вельмі цікавы. Ю.М.Міцкевіч распавёў, што гэту хату збудаваў ужо дзядзька Антось, нібы выканаўшы запавет Міхала. Якуб Колас тут не жыў. Прыязджаў толькі на час летняга адпачынку. Але і тут ёсць рэчы, звязаныя з яго дзейнасцю.

Мы з цікавасцю слухалі расповеды пра тое, што Колас любіў працаваць у нежылым канцы дома, дзе яму не перашкаджалі. Тут жа стаіць і самаробны куфэрак, у якім былі складзены кнігі народнага песняра.

Хата ў цэлым па размяшчэнні нічым не адрозніваецца ад леснічовак. Такі быў уклад сялянскага жыцця пачатку XX стагоддзя. У хаце лава, стол, хатні рыхтунак, пераважна рэчы, якія захаваліся з таго часу. На стале самавар, тут у 1912 годзе ўпершыню сустрэліся Янка Купала і Якуб Колас. Расказваючы пра гэтую падзею, Ю.М.Міцкевіч прыводзіў урыўкі з ліста Якуба Коласа да Клейнбарта, у якім паэт жартоўна адказваў на ўпартыя дамаганні пра падрабязнасці гэтай сустрэчы.

На жаль, час не дазволіў пабываць на ўсіх знакамітых мясцінах: у Дубах, на Прыстаньцы, у Чартавіцы, дзе і зараз ляжыць вялікі Чортаў Камень, таксама жывапісна выяўлены ў творчасці Якуба Коласа.

Зараз мы верым, што яшчэ не раз пройдзем па гэтых і іншых жыццёвых сцежках народнага песняра Беларусі.

**А.ЧОРНАЯ, І.ЛЯШУК,
Т.МАТЭЧКІНА, Л.ЖУКАВА,
пяты курс, факультэт
славянскай філалогіі.**

Электронны архіў бібліятэкі МГУ імені А.А. Куляшова

# вітаю Вас!

Утворчай спадчыне Якуба Коласа ёсць паэма "Сымон-музыка". Твор пра народнага мастака-самародка, пра веліч і неўміручасць народнага мастацтва.

Цікавая паэма тым, што закранае праблемы адносін паміж людзьмі, лёс народнага мастацтва. Пісьменнік своеасабліва паказаў філасофію жыцця розных саслоўяў, а мы, чытаючы, гэтую філасофію ў нейкай ступені правяраем сваім жыццём.

Кожны пісьменнік пры напісанні твора аддае шмат свайго, душэўна перажытага, што ўласціва і Якубу Коласу. Свае пачуцці, думкі, перажыванні ён перадаў галоўнаму герою, які праходзіць шлях духоўнага станаўлення. Вядома, ні ў якім выпадку нельга атаясамліваць паэта і яго герояў.

**А.МІХАЛКІНА.**

Лснікова пасада ва ўяўленнях паэта паўстае як адзін з самых чароўных куткоў зямлі, дзе прырода нібы знарок сабрала багацце красы, разнастайнасць фарбаў. У агульную панараму навакольнага хараства добра ўпісваўся "стары высокі лес цяністы"...

Багатая тая літаратура, якая мае твор такога кашталту.

**Т.ДЗМІТРЫЕВА.**



*Якуб Колас — семінарыст.*

## Уладар дум не аднаго пакалення

Я лічу Якуба Коласа найвыдатнейшым майстрам роднага слова. Яго паэзія – крыніца народнай мудрасці, дзе кожнае слова яркае, сакавітае, трапнае.

Асабіста ў мяне яго імя адразу выклікае згадку пра "Новую зямлю". Напісаць так пра родны край мог толькі паэт вялікай і шчодрай душы, які ўсім сэрцам любіў яго.

**А.ЧОРНАЯ.**



*Альбуць.*

Урамане "На ростанях" Якуб Колас не асуджае сваіх герояў, ён іх жывапісна малюе, можа часам выказаць сваё меркаванне, а ў асноўным дае чытачу магчымасць самому зрабіць вывад. Гэта мне і падабаецца ў рамане "На ростанях" і выклікае жаданне зноў сустрэцца з любімымі героямі.

**А.АТРАШЭНКА.**

"Новая зямля" – першы твор у беларускай літаратуры, у якім прырода паказана ва ўсёй яе велічы і харастве, шматколернасці фарбаў, незвычайнай маляўнічасці, у пастаянным руху.

Багацце духоўных сіл чалавека з народа – вось што на першым плане ў "Новай зямлі" і што так упрыгожвае карціны народнага жыцця, намаляваныя Коласам. У гэтых адносінах "Новая зямля" была нечым прынцыпова новым у беларускай літаратуры дакастрычніцкага перыяду і з'явай вельмі своечасовай у літаратуры пачатку 20-х гадоў. "Новая зямля" — гэта не толькі твор аб трагічным шляху селяніна, што не мог здзейсніць сваёй мары аб волі ў тых умовах, у якіх ён жыў. "Новая зямля" – гэта адначасова выдатны гімн чалавеку працы. Паэтызуючы працоўнага беларуса, Колас з найвялікшай дэталёвасцю малюе "каляндар" яго працоўнага жыцця, "труды і дні" беларускага селяніна. Нам дакладна вядома, як і чым жыве сям'я Міхала вясной, летам, восенню, зімой, у свята і ў будні.

**А.АДАМОВІЧ.**

Па характары свайго песнярскага таленту Колас, як і большасць беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, — лірык. Ён мае шмат чыстай лірыкі, але яго эпас і драма таксама дужа лірычныя. Лірыка Коласава пераважна ідэйная, але часта і прыродаапісальная, звязаная з настроем і наогул з індывідуальнымі перажываннямі паэта. Ён любіць прыроду і хараство родных вобразаў, як паэт чыстага мастацтва, але жыццё вымагае ад яго ідэйна-грамадзянскага кірунку ў матывах. І вось лірыка яго, як чыста нашаніўская, грунтуецца на вялікай любові да бацькаўшчыны, на бязмерным жаданні ёй нацыянальнага і сацыяльнага адраджэння. У прыгожай і чыстай лірыцы "Думкі ў дарозе", пастаўленай як бы замест прадмовы да "Родных з'яў", мы бачым поўную гармонію двух важнейшых матываў нашай навейшай літаратуры: нацыянальнага і сацыяльнага.

**М.ГАРЭЦКІ.**

*Калі гаварыць пра творчасць Коласа, то трэба сказаць, што самай вызначальнай яе рысай з'яўляецца веданне жыцця народнага, яго быту, яго дум, настрояў, у гэтым веданні аснова для творчасці – праўда жыцця.*

**АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ.**

**Пімен ПАНЧАНКА**

*Кнігі Коласа нам*
*І калыскай і школай былі*
*І па новай зямлі*
*Нас у сённяшні дзень прывялі.*
*Песні Коласа нас*
*Навучылі Радзіму любіць,*
*Родны край бараніць,*
*Лютых ворагаў біць,*
*Ненавідзець мінуўшчыны здані.*
*Навучылі чытаць*
*Цёмных пушчаў паданні,*
*Разумець мову зор*
*І напевы азёр,*
*Хваляў нёманскіх звон,*
*Веліч сённяшніх дзён.*

## ЖЫЦЦЯ КРЫНІЦА

Лістапад. Месяц светлы і святы. Любімы месяц многіх паэтаў. Месяц Коласа.

Лістапад. Светлы смутак. Лісце ўжо даўно апала. Нічога, апроч холаду. І ўсё ж сонца раз-пораз выглядае з-за хмар. Трэцяга лістапада яно павінна свяціць ярчэй, чым калі. Бо гэта дзень Коласа, паэта, які не проста складаў свае вершы, а спяваў іх. Сапраўднага песняра. Успомнім:

Не пытайце, не прасіце
Светлых песень у мяне,
Бо, як песню заспяваю,
Жаль вам душу скалыхне.

Памыліўся тут паэт. Шмат яго вершаў-песень на самой справе горкія і тужлівыя, але большасць усё ж чыстыя, напоўненыя светлым тонам любові да Радзімы. Калі смутак – дык і той светлы.

Столькі ўжо сказана і напісана пра нашага славутага песняра, што, здаецца, нічога нельга дадаць у абыход стандартных фраз. Што застаецца мне? Ціхім лістападаўскім вечарам, любуючыся захадам сонца і наталяючыся празрыстым водарам восеньскага сада, узгадаць любімыя радкі, "адчуць" Коласа, светлы настрой яго вершаў-песень.

Усход жыве, усход палае,
Слупы-праменні падымае,
І вось яна, жыцця крыніца.

І ўяўляеш летнюю раніцу, усход сонца, пачатак новага дня, новага жыцця. І карціна гэтая абуджае застыўшую ад лістападаўскага холаду кроў, нясе прагу дзейнасці.

Ён зайграў, і струны горна
Адклікаліся-гулі.
Аддавала іх гаворка
Гневам, крыўдаю зямлі.

І быццам чуеш тую самотную мелодыю, напоўненую крыўдай і болем, жалобную песню самой маці-зямлі. І балюча сціскаецца сэрца.

Вітай жа дарогі і новыя далі,
І вечнага руху святыя скрыжалі,
І юнасць людскую і мудрае слова,
І ясную радасць дабра перамог,
Дзе заўжды прыгожа ўсё, молада, нова.

І з'яўляецца імпэт, жаданне нешта ствараць, ісці наперад, не зважаючы на перашкоды.

...Лістапад. Светлы месяц. Месяц, які так любяць паэты, трэці дзень якога падараваў нам нашага песняра.

Лістапад...

**Вольга ДАНІЛАВА,**
**І курс ФСФ**
**("Журналістыка").**

## "З ясным сонцам побач"

Уся рэспубліка, кожны неабыякавы чалавек адзначаюць юбілейныя дні 120-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы і Я.Коласа, самых знакамітых зорак беларускай літаратуры, што вучаць шанавць і берагчы родную зямлю, мову і культуру.

Не так даўно ў Цэнтры па арганізацыі пазашкольнай выхаваўчай работы пры Магілёўскім аблвыканкаме (там многа гадоў дзейнічае "Завочная школа "Юны філолаг") была арганізавана выстаўка па творчасці Я.Купалы. Адказнасць, дасведчанасць, любоў да сваёй справы і мастацкі густ прадэманстравалі культарганізатар Міхневіч В.І, бібліятэкар А.Ю.Кавалёва, галоўны афарміцель і натхніцель Н.М.Карміліцына. Зараз тыя ж руплівыя жанчыны рыхтуюць матэрыялы да "Каласавін". Не раз пабачыўшы іх творчасць (іначай падобныя выстаўкі не назавеш), уяўляеш, што ты дакрануўся да чагосьці незвычайнага, да далёкага мінулага, але разам з тым блізкага і роднага, дарагога твайму сэрцу, што робіць цябе лепшым, спагадлівым, шчаслівым...

Глядзіш на фатаздымак, малюнак, ілюстрацыю да твораў Якуба Коласа – і на памяць прыходзяць далёкія гады твайго маленства. Як чароўна, міла гучалі (нават і зараз цёпла і лёгка становіцца на душы) з нашых вуснаў радкі:

У Савосева суседа
Быў пярэсценькі каток,
Выхаванец Паўла-дзеда,
Такі слаўны пестунок!
Нос чарнявы,
Хвост бялявы,
Задзірасценькі;
Кіпцік-шчыпчык
Заграбасценькі;
Лапкі-драпкі
Машастовыя,
А шарсціначкі
Шаўковыя.
Ґубкі, зубкі
Адмысловыя.



Якое трэба мець чуццё да мовы, да глыбіні дзіцячай душы, псіхалогіі дарослага чалавека, каб паказаць нам узор адносін, звароту да Маці, зрабіць больш чуйнымі: "Мамачка, галубка! – Просіць ён так міла. – Можа б ты на рэчку Пагуляць пусціла,", — бо мы, відаць, нешта вельмі важнае, значнае, такое неабходнае, страцілі, і Колас гэта, адчуваецца, прадбачыў, перажываў сам: "Не ў адной толькі нашай душы Зерне ёсць хараства – Аб ім казку складае ў душы Колас нівы, трава".

Паэт заклікаў служыць песнямі, справамі чалавеку, быць актыўным дзеячам для шчасця і лепшай долі народа, хацеў, каб кожны пачуў яго слова, і "той нават, чый дух заскаруз".

А слова бацькі беларускай літаратуры, народнага паэта Беларусі, былога Акадэміка АН БССР, затым яе віцэ-прэзідэнта, шырылася, мацнела, расло, як сосны пад вокнамі Коласавага дома, саграваала, радавала ўсіх, як сонца, блакіт неба, каласілася і красавала, як жыта, сеянае паэтам.

"Усе паэты з маленства", — справядліва зазначаў Сент-Экзюперы. Нарадзілася, расло, мужнела незвычайна ўражлівае дзіця ў Міцкевічаў, не падобнае на ўсіх астатніх, што хацела як мага лепш убачыць, пазнаць свет прыроды, злавіць яшчарку ў мутнай весняй вадзе, паслухаць спеў птушак, таямніцы светлых хмарак, пошук спрадвечнага бору, бульканне вясновых ручайкоў, убачыць белыя крылы буслоў, трапятанне жаўрука. Цяга да паэтычнага слова, любоў да прыроды, да людзей не пакідалі Коласа ўсё яго жыццё. Самы малюнкавы паэт трывала зросся з роднай зямлёй, якая падарыла яму незвычайны талент і ў якой ён чэрпаў сілы:

Ад роднае зямлі, ад гоману бароў,
Ад казак вечароў,
Ад песень дудароў,
Ад светлых воблікаў закінутых дзяцей,
Ад шолаху начэй,
Ад тысячы ніцей,
З якіх аснована і выткана жыццё
І злучана быццё і небыццё –
Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў
І выхаду шукаў
Адбітак родных з'яў
У словах-вобразах, у песнях вольна-плынных.

Моц і сілу Коласу – чалавеку, паэту, грамадскаму дзеячу – надвалі і незнаёмыя, і родныя, мяркуючы па шчырых яго словах аб жонцы: "Пакідалі мы дзве каляіны, але песня адна ў іх гучыць". Яго дух, розум, мары перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Сапраўднае мастацкае слова-песня змагаецца за пераўтварэнне жыцця, за шчасце народа:

А той мут, што жыццём называем,
Страсяні і да дна ўскалышы,
Няхай сэрца ў грудзях узыграе
І зазвоняць усе струны душы.

Самае галоўнае – не быць абыякавым, раўнадушным да ўсяго, што акружае вас. Прырода такая ж жывая, як і сам чалавек, "і ніхто няхай не забывае, што ён частка вялікай прыроды": калі яны ў згодзе – лягчэй жыць, нягледзячы на праблемы, тлум, розныя недарэчнасці сучаснасці. Помніце, упэўненасць, вера Коласава ў светлае будучае павінны жыць у кожным: "Хоць вечна мы блукаемся, А ўсё ж такі, хоць некалі, А праўды дачакаемся".

**Т.ЯКУБОВІЧ.**

## СЦЕЖКАМІ Магілёўшчыны



Настаўнікі беларускай мовы і літаратуры Ленінскага раёна г. Магілёва не толькі вывучаюць з дзецьмі жыццёвы і творчы шлях Я.Коласа, прывіваюць любоў да роднага слова, але і самі знаёмяцца з такімі бакамі іх дзейнасці, якія не кожнаму вядомы. Сёлета на пасяджэнні метадычнага аб'яднання закраналіся цікавыя старонкі, звязаныя з працай, жыццём, наведваннем Я.Коласам многіх мясцін Магілёўшчыны. Мала хто ведае, што знакаміты пясняр яшчэ ў маладым узросце працаваў настаўнікам у прыватнай беларускай школе для сялян, якую адкрыў пан К.Гардзялкоўскі. Якуб Колас лічыў тады настаўніцкую прафесію асноўным сваім заняткам, меў немалы вопыт выкладання ў школе, сам займаўся падрыхтоўкай вучэбна-метадычных дапаможнікаў і таму адносіўся да сваіх абавязкаў шчыра і добрасумленна. Умеў абудзіць душы дзяцей, зацікавіць іх пыродай, цудамі навакольнага свету, выклікаць на шчырую гутарку. Маладога настаўніка паважалі сяляне і сам пан Гардзялкоўскі. Шкада было Коласу спыняць распачатую справу, яго выхаванцы паспяхова здалі экзамен за пачатковы курс, палюбілі свайго настаўніка, але трэба было вяртацца ў родную Мікалаеўшчыну, таму што ішло следства па справе ўдзелу ў настаўніцкім нелегальным з'ездзе.

Сувязей з Магілёўшчынай Я.Колас не перарываў і ў далейшым. На працягу ўсяго свайго жыцця ён некалькі разоў наведваў наш край, вёў актыўную перапіску з жыхарамі. У 1925 годзе паэт прыязджае для чытання лекцый, правядзення гутарак па гісторыі беларускай літаратуры, чытання сваіх твораў і іншых узораў беларускага пісьменства. Якуб Колас, прыбываючы ў вёскі, ахвотна ўдзельнічаў у сходах сялян, якія пераатвараліся ў сапраўдныя дыспуты, вёў растлумачальную работу сярод насельніцтва аб бягучых падзеях.

Разам з Максімам Гарэцкім пясняр некаторы час знаходзіўся ў Мсціслаўскім педтэхнікуме (тут вучыліся А.Куляшоў, З.Астапенка, Ю.Таўбін) і чытаў там лекцыі па граматыцы і методыцы выкладання беларускай мовы на курсах па павышэнні кваліфікацыі настаўнікаў. Якуб Колас, будучы настаўнікам па прафесіі, цікавіўся дзейнасцю маладой сярэдняй навучальнай установы, імкнуўся дапамагчы педкалектыву ў наладжванні работы не толькі добрым словам, але і канкрэтнай справай.

Цікавым і цёплым было знаёмства з вучнямі і настаўнікамі першай школы-дзесяцігодкі, дзе ў той час працаваў дырэктарам добры сябар Якуба Коласа – Алесь Фурсевіч. Ён здолеў захапіць аўдыторыю расказам не толькі аб творчасці, але і аб дзіцячых і юнацкіх гадах, вучобе ў настаўніцкай семінарыі ў Нясвіжы. Колас выступіў з прамовай, расказаў аб стварэнні паэм "Новая зямля" і "Сымон-Музыка", даставіў прысутным вялікую асалоду майстэрскім чытаннем урыўкаў з паэм, вершаў. Асабліва спадабаўся яму студэнцкі хор. Запявале хора, студэнтцы Валянціне Чэсловай дапамог паступіць вучыцца ў Мінск, дзе пазней яна спявала ў оперным тэатры.

Наступная паездка Я.Коласа на Магілёўшчыну звязана з наведваннем Горак (1925), дзе ён выступае з віншавальнай прамовай ад імя пісьменніцкай арганізацыі на адкрыцці Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і ўдзельнічае разам з Янкам Купалам у святкаванні. У Горкі прыязджае не раз і пазней (разам з Я.Купалам каля 10 разоў).

Наведваў Якуб Колас і Клімавічы, Хоцімск, Быхаў, Магілёў, Шклоў, Бабруйск, выступаючы з прамовамі перад моладдзю, настаўніцтвам, рабочымі прадпрыемстваў, сялянамі, удзельнічаючы ў сходах пісьменнікаў, месячніках культуры, агітацыйна-масавых кампаніях і г.д.

Мы – настаўнікі, вучні, студэнты, усе сучаснікі росквіту культуры народа – павінны несці эстафету сыноўняй любові да бацькоўскага краю, вялікай павагі да спадчыны выдатных пісьменнікаў і дзеячаў культуры, падтрымліваць непарыўную сувязь людзей і эпох.

**Г.М.ШЧЭРБА,**
**кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Ленінскага раёна г. Магілёва.**

*Якуб Колас – гэта цэлы свет, свет дзівосна-багаты і непаўторны, у якім месціцца родная зямля, яе народ, яго жыццё і гісторыя.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Размышление по поводу учебы

**Продолжение. Начало в № 8 (68).**

**Пятое.** Проверка знаний хромает на обе нижние конечности, да еще и на верхние прихрамывает, пожалуй. Вполне реально выучивать весь курс за время сессии, а семестр «отдыхать», периодически появляясь на лекциях – потому как «Надо». И долго ли держатся выученные подобным способом знания? Студент не знает предмет только в двух случаях – или еще не сдавал, или уже сдал. Не лучше ли проводить, скажем, раз в месяц, тесты, по результатам которых вполне можно вылететь из вуза на плац? А в конце – экзамен, жестче тестов, с уже упоминавшейся комиссией.

**Шестое.** Система обязательного посещения занятий себя тоже изжила. Да, студенты вынуждены приходить на лекции даже тогда, когда они знают курс или он им просто не нужен. И что же они делают? Старательно пишут конспекты, жадно ловя каждое слово преподавателя? Как бы не так. Ну так изгоните ленивых! Наберите больше людей на первый курс и просто тщательно отфильтруйте его.

**Седьмое.** Взаимоотношения преподавателей и студентов. Сразу оговорюсь: буду писать не обо всех.

Преподаватели, единолично оценивающие успеваемость студентов, бывает, и злоупотребляют этой властью. И унижают студентов, и обзывают их, избирают себе «немилых» и последовательно проводят политику давления вплоть до исключения. Казалось бы, это относится к тем курсам, по которым сдают экзамен. Как раз на экзамене легче: в третий раз собирается комиссия, а ведь зачетом можно довести студента до несдачи достаточного количества экзаменов для исключения.

Что самое мерзкое – это угодничество студентов, угадывающих, чего хочет «Он», и отвечающих так, чтобы понравилось, а не то, что думают. В итоге целые группы заучивают мнение Ивана Иваныча, потому что у Ивана Иваныча есть только два мнения – его и неправильное.

Но бывает и еще хуже. Бывает публичное унижение студентки под не только гробовое молчание студентов – в первую очередь мужчин, для которых честь дамы, по идее, должна быть превыше всего, — но и под подобострастный смех и улюлюканье. Я сам тоже молчал. Потому что страшно. И раба из себя сложно не только выдавить, но даже захотеть выдавливать. Когда все преподаватели и студенты будут строить взаимоотношения на принципах взаимного уважения?

**Восьмое.** Взаимоотношения студентов. В группе нередки случаи «подсиживания» ради выгоды, устанавливаются враждебные отношения между группами, между отделениями с открытыми боевыми действиями между факультетами. Вспомните КВН. Или день первокурсника. Любой праздник — конкурс и кричащих, и обижающихся, и гневных болельщиков, готовых чуть ли не разорвать в клочья более удачливых соперников. А многочисленные «закрытые» мероприятия? Физматовская юморина, например. Можете представить, чтобы там выступал представитель филфака? Нет? А зря. Прецедент был. То есть можно сломать лед, если объединить усилия администрации, деканатов и студентов. Создавать сборные команды и проводить соревнования между ними,а не на факультетском принципе.

Говорить можно и дальше. Но какой смысл, если и эта статья ничего не изменит, кроме разве что отношения к автору и студентов, и преподавателей? Посему заканчиваю грустные размышления.

**Студент.**



## Бесценный дар

*Нет дара бесценней материнского. И этот дар – жизнь.*

Мама. Первые глаза, первый ласковый голос, первые прикосновения – это мама. Ты наш первый друг, защитник, учитель. К тебе, мама, идем мы со своими проблемами, в твоих руках ищем поддержки, в твоих глазах – понимания. Мать – единственный человек на всем белом свете, который любит нас такими, какие мы есть: со всеми нашими недостатками.

Но как часто мы бываем эгоистичны, несправедливы к нашим близким, не замечая боль, которую причиняем им. И только мама всегда прощает нас, порою злых и безжалостных детей.

И часто в суете дней мы забываем сказать маме, что мы любим ее, сказать о том, что она всегда с нами в нашем сердце и мыслях. И хорошо, что есть такой день, который принадлежит нашим родным и любимым мамам.

В Могилевском государственном университете им А.А.Кулешова свято чтут этот светлый праздник, который вся республика отмечает 14 октября. В этот день отделом воспитательной работы совместно с Советом женщин был организован праздничный вечер в студенческом кафе «Лабиринт» для студенток-матерей и сотрудников университета, имеющих детей, где был сладкий стол, игры, конкурсы, концерт и, конечно, подарки всем мамам: молодым и со стажем. Профсоюзы выделили материальную помощь, отдел воспитательной работы подобрал подарки мамам и организовал очень теплый вечер в кафе, на котором более опытные мамы и бабушки поделились мыслями о воспитании детей. М.Ю.Ганин взял интервью у дважды бабушек, где подробно выпытал все секреты кулинарных рецептов и тайны воспитания в семьях педагогов, а также проверил познания молодых мам в прачечном деле и умение кормить малышей даже с закрытыми глазами.

Много теплых слов было сказано женщинам проректором по учебно-методической работе Н.П.Бузуком, начальником воспитательного отдела Т.Н.Кузьминой, председателем Совета женщин университета Т.А. Старовойтовой и многими другими. Этот вечер согрел сердца, оставил ощущение нежности.

А в заключение еще раз спасибо Вам, наши родные, за вашу заботу и любовь, за свет Ваших глаз и теплоту души. Счастья, успехов и здоровья Вам и Вашим близким!

**В.ШАГИНОВА.**

*Рэктарат універсітэта шчыра віншуе*
***КУЗІНУ***
*Таццяну Васільеўну,*
***КАЖАКІНУ***
*Ганну Аляксандраўну,*
***КУЗНЯЦОВА***
*Віталія Дзмітрыевіча,*
***РАКАВУ***
*Эму Дзмітрыеўну*
*з юбілеем!*
*Няхай шчасце, дабрабыт, светлыя пачуцці спадарожнічаюць Вам у жыцці.*

## ПАЛАЖЭННЕ

### Аб конкурсе творчых работ студэнтаў "Мой універсітэт", прысвечаным 90-годдзю з дня заснавання МДУ імя А.А.Куляшова

**1. Мэты і задачы конкурса:**

– прапаганда дасягненняў аднаго са старэйшых ВНУ рэспублікі;

— выхаванне ў студэнцкай моладзі павагі да гістарычнага мінулага універсітэта;

— фарміраванне якасцяў патрыёта, грамадзяніна сваёй рэспублікі, вобласці, горада, універсітэта;

— выяўленне таленавітых юнакоў і дзяўчат;

— развіццё творчых здольнасцяў студэнтаў;

— станаўленне традыцый ВНУ.

**2. Парадак правядзення конкурса:**

Творчы конкурс "Мой універсітэт" праводзіцца з кастрычніка 2002 г. па кастрычнік 2003 г. па наступных накірунках:

— малюнак;

— вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

— проза;

— вершы;

— музычная творчасць;

— насценны друк (газета, тэматычны бюлетэнь, плакат).

Удзельнікамі конкурса могуць быць як асобныя студэнты, так і творчыя калектывы.

Конкурсныя работы, якія вытрымалі адбор на факультэтах, павінны быць прад'яўлены да 1 лістапада 2003 года ў аддзел выхаваўчай работы (каб. 300, вуч. кор. № 1).

Крытэрыі адзнак творчых работ:

— раскрыццё тэмы, ідэі;

— арыгінальнасць выканання;

— мастацкі ўзровень і майстэрства.

**3. Кіраўніцтва конкурсам.**

Арганізацыю конкурса на факультэтах забяспечваюць нам. дэканаў па выхаваўчай рабоце, ва уніерсітэце – аргкамітэт у наступным складзе:

1. Папоў У.І. – прарэктар па вучэбнай рабоце, кандыдат гістарычных навук, дацэнт – старшыня;

2. Шышкіна В.А. – прафесар кафедры педагогікі дзяцінства і сям'і, кандыдат педагагічных навук;

3. Міхальчук Т.Р. – заг. кафедрай рускай мовы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

4. Вараб'еў А.А. – ст. выкладчык кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання;

5. Забелаў П.П. – нам. дэкана па выхаваўчай рабоце педагагічнага факультэта, ст. выкладчык кафедры музыкі і ігры на народных інструментах;

6. Якубовіч Т.І. – дацэнт кафедры беларускай і рускай моў;

7. Набокава Л.В. – метадыст аддзела выхаваўчай работы;

8. Навіцкая Т.Ф. – старшыня прафкома студэнтаў.

**4. Падвядзенне вынікаў і заахвочванне пераможцаў конкурса.**

Вынікі конкурса падводзяцца аргкамітэтам да 10 лістапада 2003 года. Пераможцы заахвочваюцца дыпломам, грашовай прэміяй альбо каштоўным падарункам.

У час правядзення юбілейных мерапрыемстваў з нагоды 90-годдзя МДУ імя А.А.Куляшова будзе арганізавана выстава лепшых работ пераможцаў конкурса.

Фінансаванне конкурса забяспечваецца за кошт стыпендыяльнага фонда і сродкаў, выдзеленых прафкомам студэнтаў.







## "МоГУ", наконец-то, смогло... победить "На грани"

### Хит-парад «Лабиринта»

В сентябре опять открыл свой сезон студенческий клуб в кафе «Лабиринт». Клуб предлагает новую диско-программу, посвященную золотой осени. В ноябре в кафе состоится вечер блюза, который соберет любителей этого жанра. Следите за рекламой.

Теперь хит-парад «Лабиринта».

1 место «Краски» — «Наверное».

2 место «Динамит» — «Я тебя не забуду».

3 место «Лорента» — «Орхидея».

Групповые заявки принимаются с 17 до 18 часов в кафе «Лабиринт».

**Председатель клуба**
**М.Ю. ГАНИН.**

## СПОРТ Пришло время больших и малых побед

Благодаря стараниям преподавателей и тренеров кафедры физической культуры и спорта факультета физического воспитания, студенты МГУ им. А.А.Кулешова имеют возможность заниматься спортом как на любительском, так и на профессиональном уровне. Многие студенты поднялись на пьедесталы почета как нашей страны, так и многих других стран мира.

Но хочется вернуться к жизни университета. Надо отметить студентов факультета физического воспитания, принявших участие в первенстве ФФВ по кроссу. В командном первенстве места распределились следующим образом: 1 место заняла группа № 21, набравшая 813 очков, 2 место у группы № 22 (729 очков), и, наконец, на 3 месте группа № 12 (694 очка).

В личном первенстве стали лучшими среди юношей:

1 место – Дюно Е., группа № 21, время – 2 мин. 30 сек. На вторую ступеньку поднялся Назаров В., группа № 33, 2 мин. 33 сек. И третье место занял студент 22-й группы И.Величко, 2 мин. 34 сек.

Среди девушек первое место заняла Т.Масленкова, студентка гр. № 23, 1 мин. 18 сек. Второе место заняла студентка этой же группы А.Пиронет, 1 мин. 22 сек, и третьей финишировала О.Могильникова, студентка группы № 31, 1 мин. 36 сек.

Факультет физического воспитания и спортивный клуб университета поздравляет победителей и призеров первенства, а также всех участников, т.к. известно, что главное – это не победа, а участие!

**Спортклуб.**

### Приглашаем вас, первокурсники!

*Первокурсники!* Вот вы и достигли заветной цели – вы студенты. Прошел страх перед первыми лекциями и семинарскими занятиями. Пора посмотреть со стороны и поглубже узнать, что из себя представляет вуз, в котором вы учитесь. Это лучше всего сделать в музеях университета. Здесь вы узнаете об истории вуза, которая начинается с 1913 года, получите наглядное доказательство высокого престижа и эффективности учебного процесса, основу которого заложило не одно поколение.

Приглашаем вас посетить музеи университета, которые создавались преподавателями и студентами нашего вуза.

***Заявки на экскурсии просим подавать в музей истории университета (ауд. 408).***



**ЗАСНАВАЛЬНІК**
Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова

**Рэдактар Л.І.ШЫШАКОВА,**
старшы выкладчык кафедры беларускай і рускай моў

*Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.*

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
212000, г. Магілёў,
вул. Касманаўтаў, 1.
☎ 26-13-83

Рэгістрацыйны № 6580. Падпісана да друку а 17 гадзіне 23.10.2002 г. Тыраж 250 экз. Газета набрана і надрукавана ў абласной друкарні (г. Магілёў, вул. Першамайская, 70)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова